Установа адукацыі
«Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»

Кафедра тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права
палкоўнік міліцыі
М.А.Пашкееў
29.10.2024

Регистрационный № ___

# ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНА
**па вучэбнай дысцыпліне**
# ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ
(уключаючы навучальныя дысцыпліны «Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый)» і «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)»
«ТЭАРЭТЫКА-ПРАВАВЫ МОДУЛЬ»

для спецыяльнасці:
6-05-0414-02 Дзяржаўнае кіраванне і права

Минск, 2024

***Распрацаваў:***
Лапановіч С.Ф., кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

***Рэцэнзент:***
Мурашка А.І., кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

***РЭКАМЕНДАВАНЫ ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:***
Кафедрай тэорыі і гісторыі дзяржавы і права ўстановы адукацыі «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. (Пратакол № 4 ад 29.10.2024)

1. Прадмет і метадалогія, перыядызацыя і гістарыяграфія гісторыі дзяржавы і права Беларусі.
2. Канцэпцыі паходжання дзяржаўнасці і права. Зараджэнне дзяржаўнасці ўсходніх славян у IX–X стст. Полацкае, Тураўскае, Смаленскае і іншыя княствы як першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях (IX–першая палова XIII стст.).
3. Грамадскі і дзяржаўны лад дзяржаў-княстваў на тэрыторыі Беларусі ў раннім сярэднявеччы (IX – першая палова XIII стст.).
4. Характэрныя рысы і сутнасць раннесярэднявечнага звычаёвага і пісанага права (IX – першая палова XIII стст.).
5. Характарыстыка крыніц права ранняга сярэднявечча (IX – першая палова XIII стст.). Руская Праўда, міжнародны дагавор 1229 г., царкоўныя Статуты («Уставы») кн. Уладзіміра Святаслававіча і кн. Яраслава Мудрага.
6. Навуковыя канцэпцыі ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Фарміраванне тэрыторыі дзяржавы, яе адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ў другой палове XIII– першай палове XVI стст.
7. Грамадскі і дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XIII – першай палове XVI стст.
8. Вышэйшыя органы ўлады Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XIII – першай палове XVI стст. Вышэйшыя службовыя асобы (земскія і дворныя), іх кампетэнцыя.
9. Мясцовыя органы ўлады Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XIII – першай палове XVI стст. Сістэма органаў кіравання і суда ў гарадах на магдэбургскім праве.
10. Сістэма вышэйшых судоў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XIII – першай палове XVI стст.
11. Сістэма мясцовых і саслоўных судоў Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XIII – першай палове XVI стст.
12. Сістэмнае рэформаванне дзяржаўнага ладу Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў 60-х гг. XVI ст.(парламенцкая, тэрытарыяльная, ваенная і аграрная рэформы).

13. Судовая рэформа Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў 60-х гг. XVI ст. Сістэма паслярэформенных мясцовых судоў (гродскі суд, земскі суд, падкаморскі суд).
14. Міжнародныя адносіны Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага з замежнымі дзяржавамі. Унійныя пагадненні з Польскім каралеўствам у канцы XIV – першай палове XVI стст.
15. Агульная характарыстыка прававой сістэмы Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў другой палове XIII – першай палове XVI стст. Класіфікацыя і аналіз крыніц права дастатутавага перыяду.
16. Агульназемскія, абласныя прывілеі XIV – XVI стст. і Судзебнік Казіміра Ягайлавіча 1468 г.: гісторыка-прававая характарыстыка.
17. Статуты Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1529 г. і 1566 г. : гісторыка-прававая характарыстыка.
18. Характэрныя рысы асноўных галін права Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў XV – XVI стст. Крымінальнае права.
19. Прычыны ўтварэння Рэчы Паспалітай. Люблінская унія Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага і Кароны Польскай 1569 г.
20. Грамадскі і дзяржаўны лад беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай (1569-1763 гг.).
21. Вышэйшыя органы ўлады і кіравання Рэчы Паспалітай (1569–1763 гг.).
22. Мясцовыя органы ўлады і службовыя асобы мясцовай адміністрацыі Рэчы Паспалітай (1569–1763 гг.).
23. Сістэмны крызіс і спробы рэфармавання дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай (1763–1795).
24. Прычыны склікання і дзейнасць Чатырохгадовага сойма Рэчы Паспалітай (1788 – 1792 гг.). Канстытуцыя 3 мая 1791 г.: гісторыка-прававая характарыстыка.
25. Прычыны і наступствы падзелаў Рэчы Паспалітай. Паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі.

26. Канфесійнае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім, Рускім і Жамойцкім у XIV – XVI стст. Берасцейская царкоўная унія 1596 г.
27. Судовая сістэма Рэчы Паспалітай: вышэйшыя і мясцовыя суды. Галоўны Трыбунал ВКЛ: парадак фарміравання і юрысдыкцыя.
28. Агульная характарыстыка прававой сістэмы Рэчы Паспалітай (1569 – 1795 гг.). «Генрыкавы артыкулы» і «Пакта канвента».
29. Статут Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага 1588 г. (распрацоўка, зацвярджэнне, крыніцы, сістэма, значэнне).
30. Цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады Расійскай імперыі на тэрыторыі беларускіх зямель (канец XVIII - пачатак XX стст.).
31. Асаблівасці грамадскага і дзяржаўнага ладу Паўночна-Заходняга краю Расійскай імперыі (канец XVIII - пачатак XX стст.).
32. Асаблівасці судовай сістэмы Расійскай імперыі на тэрыторыі заходніх губерняў (канец XVIII - пачатак XX стст.).
33. Прычыны правядзення буржуазных рэформаў у 60 – 70 гг. XIX ст. Адмена прыгоннага права ў Расійская імперыі (1861 г.) і асаблівасці сялянскай рэформы на беларускіх землях.
34. Буржуазные рэформы (судовая, земская, гарадского самакіравання) у 60 – 70 гг. XIX ст., асаблівасці іх правядзення ў заходніх губернях. Прычыны і наступствы контррэформаў ў апошняй чверці XIX ст.
35. Асаблівасці прававой сістэмы заходніх губерняў Расійскай імперыі (канец XVIII - пачатак XX стст.). Праект Звода мясцовых законаў Заходніх губерняў: распрацоўка і змест.
36. Падзеі першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі 1905-1907 гг. у Беларусі. Скліканне Дзяржаўнай думы Расійскай імперыі. Сталыпінская аграрная рэформа.
37. Беларускія землі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 – 1918 гг.). Акупацыя беларускіх зямель кайзераўскай Германіяй.
38. Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. і троеўладдзе ў Беларусі. Рэвалюцыйныя пераўтварэнні і беларускі нацыянальны рух у сакавіку – кастрычніку 1917 г.
39. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і ўсталяванне савецкай улады ў Беларусі. Кампетэнцыя і дзейнасць Абласнога выканаўчага камітэту Заходняй вобласці і Заходняга фронта (Аблвыканкамзаха).

40. Першы Ўсебеларускі з’езд у снежні 1917 г. і яго рашэнні. Брэст-Літоўскі мірны дагавор (1918 г.). Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (1918 г.).
41. Абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі ў студзені 1919 г.: прычыны і наступствы. Першы з’езд Саветаў ССРБ (люты 1919 г.) і стварэнне Літоўска-Беларускай ССР.
42. Прычыны і наступствы Польска-савецкай вайны. Другое абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі 31 ліпеня 1920 г.
43. Рыжскі мірны дагавор 1921 г. : гісторыка-прававы аналіз. Прававое становішча заходнебеларускіх земель ў Польскай Рэспубліцы.
44. Прававая сістэма ССРБ у 1917–1922 гг. Канстытуцыя ССРБ 1919 г., унясенне ў яе змяненняў і дапаўненнняў.
45. Дзяржаўна-прававыя адносіны ССРБ і РСФСР (1919–1922 гг.). Уваходжанне БССР у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (1922 гг.): працэс і наступствы.
46. Дзяржаўны лад БССР у 1922–1939 гг.
47. Грамадскі лад БССР у 1922–1939 гг.
48. Прававая сістэма БССР у 1922–1939 гг. Развіццё асноўных галін права.
49. Распрацоўка, асноўныя палажэнні и значэнне Канстытуцыі БССР 1927 г.
50. Канстытуцыя БССР 1937 г.: гісторыка-прававы аналіз.
51. Судовы лад і працэсуальнае права БССР у 20-я–30 гг. XX ст.
52. Грамадскі і дзяржаўны лад Польскай Рэспублікі (1918-1939 гг.), палітыка польскіх улад у Заходняй Беларусі.
53. Нацыянальна-вызваленчая барацьба беларускага народа ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.).
54. Пачатак Другой сусветнай вайны (1939 г.). Уз’яднанне Заходняй Беларусі і БССР.
55. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Змены ў дзяржаўным ладзе і прававой сістэме СССР і БССР у час Вялікай Айчыннай вайны (1941 – 1945 гг.).

56. Нямецкі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі (1941 – 1944 г.). Генацыд беларускага народа.
57. Усенародная барацьба савецкага народа з фашысцкімі захопнікамі на акупіраванай тэрыторыі. Партызанскі рух і антыфашысцкае падполле ў Беларусі (1941 – 1944 г.).
58. Пачатковы этап вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў (1943 г.). Аперыцыя “Багратыён” (1944 г.). Заканчэнне Вялікай Айчыннай (1945 г.).
59. Грамадскі і дзяржаўны лад БССР у другой палове 40-х – сярэдзіне 80-х гг. ХХ ст.
60. Распрацоўка, асноўныя палажэнні и значэнне Канстытуцыі БССР 1978 г.
61. Прававая сістэма БССР у 40–80-я гг. ХХ ст. Сістэматызацыя заканадаўства.
62. Сістэмны крызіс у СССР. Спробы рэфармавання палітычнай сістэмы, палітыка «Перабудовы» (1987 – 1991 гг.).
63. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 1990 г. Скасаванне СССР і стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (1991 г.).
64. Першая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. і яе палітыка-прававая эвалюцыя. Рэферэндумы Рэспублікі Беларусь 1995, 1996, 2004 і 2022 гг.
65. Дзяржаўны лад Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе (канец ХХ – пачатак ХХІ стст.).
66. Прававая сістэма Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе (канец ХХ – пачатак ХХІ стст.).
67. Міжнародная дзейнасць БССР і Рэспублікі Беларусь. Удзел у ААН і іншых міжнародных арганізацыях.
68. Саюз Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Статут Саюза Расіі і Беларусі 1997 г.